НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Калі мы перастаём верыць у казкі... Зрэшты, а мы, і праўда, перастаём верыць у казкі? Хіба ў марах, якія і ў дзяцінстве, і ў сталым узросце ствараем сваім уяўленнем і недзе глыбока ў душы спадзёмся, што яны калі-небудзь збудуцца, не бывае нічога казачнага? Калі вы лічыце, што не, то, магчыма, апавяданне Станіславы Умец не выкліча ў вас асаблівых эмоцый. Калі ж незвычайныя мары — верны спадарожнік вашага жыцця, то, хто ведае, можа, вам яшчэ не раз захочацца яго перачытаць.**

**Алесь БАДАК.**

Станіслава УМЕЦ

# ДАМОК З ЗЯЛЁНЫМІ АКАНІЦАМІ

АЛЕЛЬКА нарадзіўся ў сям'і пекара і швачкі. Жылі яны душа ў душу. Бывала, збяруцца ўвечары ў маленькай гасцёўні — і бацька пачне чытаць свае вершы. Нязграбныя, але такія пранікнёныя і чуллівыя, што нават Алелька ледзь не плача. Хацелася б і



яму скласці колькі радкоў пра каханне, ды толькі не было каму іх прысвяціць. І вось аднойчы па волі лёсу ён атрымаў ліст ад дзяўчынкі па імені Эма — і з ўсёй палкасцю ўзяўся адказваць.

У лёсу было жаночае аблічча і зусім канкрэтнае імя — Вера Яфімаўна, паштарка, якая выпадкова закінула Эмін ліст не ў тую скрынку. Алелька сардэчна называў яе добрай феяй, калі сутыкаўся з ёю ля веснічак і, з ейнай ласкі, атрымліваў доўгачаканы канверт замест суседа.

Вера Яфімаўна працавала феяй тры гады, а пасля выйшла на пенсію. І цуды раптам скончыліся...

* * *

Фіялетавы аўтобус без нумара і пэўнага напрамку прадзіраўся праз гушчар. Па вокнах хвасталі галіны. Нарэшце, наперадзе заззяла сонца — і аўтобус хутка выбраўся на паплавец. Высадзіўшы бабульку з ёю з клуначкам, ён памчаў далей. А старая закульгала па высокай сакавіта-зялёнай траве да статка беласнежных авечак, кучаравых і лёгкіх, як тыя воблачкі. Эма калісьці даўно ўжо назірала гэтую карціну, толькі тады побач з бабулькай шпарка крочыў зухаваты дзядок у клятчастым пінжаку.

Ля рачулкі выйшаў хлопец з вязанкай кніг. У вузкім месцы аўтобус пераскочыў на другі бок і, падкаціўшы да высачэзнага замка з ружовымі вежамі, высадзіў маленькую золатавалосую прынцэсу. Праз колькі хвілін ён зноў спыніўся. Эма дакладна ведала, што зараз яе чарга выходзіць. На ўскрайку лесу дзяўчыну чакаў дамок з зялёнымі аканіцамі, абкружаны фруктовым садам. Яна прыязджала сюды ў дзяцінстве, частавалася яблыкамі і грушамі, гуляла ў лялькі, піла малаком ката Ваську. Не менш за пятнаццаць гадоў прайшло, а тут быццам нічога і не змянілася.

Эма ўвайшла ў дамок і аслупянела ад здзіўлення: у крэсле з катом на каленях сядзеў малады чалавек прыемнага выгляду, хіба што крыху паўнаваты. Ён адразу ж падхапіўся — і Васька з незадаволеным мяўканнем саскочыў на падлогу.

— Я чакаў цябе, — прамовіў незнаёмец. — Пяць гадоў чакаў. Я ведаў, што аднойчы ты абавязкова завітаеш сюды!

— Але адкуль ты даведаўся пра гэтае месца? — не магла ўцяміць Эма.

— Ты пісала мне пра дамок з зялёнымі аканіцамі, пра свае дзіцячыя мары...

— Алелька?

* * *

— Эма! Прачынайся, праз паўгадзіны выязджаем!

Дзяўчына расплюшчыла адно вока, пасля — другое. Над ёй навісла бялявая матчына галава. «Выязджаем? Куды? — спрасонку не зразумела Эма, але тут жа радасна ўспомніла: — Дамоў, мы едзем дамоў!» Бацька скончыў справы ў Вроцлаве — і яны вяртаюцца ў Мінск.

Увесь няблізкі шлях дадому Эма думала пра свой дзіўны сон. У дзяцінстве ёй так хораша, так утульна было ў дамку на ўскрайку лесу, які намалявала яе ўяўленне. Яна прыязджала туды штоноч. Але, аднойчы спазніўшыся на фіялетавы аўтобус, Эма, як ні намагалася, больш не магла на яго патрапіць. Пэўна, вырасла, перастала марыць. Чаму ж сёння яна зноў убачыла гэты сон?

Думала дзяўчына і пра Алельку. Чаму ён пакінуў пісаць ёй? Яна ж даслала яму новы адрас у апошнім лісце. Пяць гадоў прайшло, а Эма так і не здолела забыць Алельку.

* * *

Пяць гадоў прайшло, а Алелька так і не здолеў забыць Эму. Нават аканіцы бацькоўскай хаты пафарбаваў у зялёны колер — яе любімы.

Ён працягваў дасылаць Эме лісты, цёплыя і пяшчотныя, як духмяныя булачкі. Алелька нават не падазраваў, што нейкая паштарка, імя якой гісторыя не называе, злосна запіхвае іх у перапоўненую скрынку, дзе яны чакаюць не дачакаюцца адрасата. На шчасце, у адрозненне ад булачак, мяккія словы не чарсцвеюць.

І вось аднаго разу Алелька праз кухоннае акно заўважыў ля веснічак дзяўчыну з канвертам у руках. Прыняўшы яе за новую паштарку, ён скінуў фартух і выбег з дома. Ды раптам спыніўся. Гэта была дзяўчына з яго сноў. Гэта была Эма.

— Вырашыла не давяраць пошце свой ліст, — усміхнулася яна. — Ну што, пачастуеш мяне булачкамі?

## Даты Падзеі Людзі

### 14 СНЕЖНЯ

**1503** год — нарадзіўся Настрадамус, французскі ўрач, вучоны і прадказальнік. Многія ўчытваюцца ў яго прароцтвы, шукаючы ў іх апісанне падзей будучыні, іншыя лічаць, што гэта проста шарлатанства, лёгкі спосаб заваяваць славу прарока. Аднак жыццёвы шлях Настрадамуса наўрад ці назавеш лёгкім.

**1720** год — ратуючыся ад спустошаных і раз'юшаных укладчыкаў і кінуўшы ў Парыжы жонку, дачку і брата, з французскай сталіцы таемна збег у Брусель Джон Ло, англійскі авантурыст-эканаміст, які здолеў паставіць пад свой кантроль усе фінансы Францыі. Да гэтага Ло, шатландскі эмігрант, які пакінуў радзіму пад страхам суда за забойства на дуэлі, змог узвысіцца да пастоў міністра фінансаў Францыі, дырэктара Дзяржбанка і кіраўніка гіганцкай каланіяльнай «Кампаніі абедзвюх Індый». Усяго гэтага ён дасягнуў дзякуючы сваёй ідэі, якая заключалася ў тым, што для аздараўлення фінансаў і пераадолення эканамічнага застою дзяржаве патрэбныя банкноты асабліва, лепш за ўсё дзяржаўнага, банка. Фінансавая сістэма краіны, якую Ло ператварыў у своеасаблівую «акцыянерную піраміду», рухнула, узбагаціўшы толькі некалькі спрытных дзяльцоў і паставіўшы Парыж перад пагрозай маштабнага бунту.

**1911** год — Руаль Амундсен дасягнуў Паўднёвага полюса, на месяц апярэдзіўшы англійскую экспедыцыю Роберта Скота.

**1922** год — нарадзіўся Мікалай Генадзевіч Басаў, фізік, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, замежны член НАН Беларусі, акадэмік АН СССР, Расійскай акадэміі



навук, ганаровы доктар шэрагу ўніверсітэтаў, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Адзін з заснавальнікаў квантавай электронікі. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1964), Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР. Аўтар больш чым 130 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій. Памёр у 2001 годзе.

**1922** год — на Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прынята рашэнне аб уваходжанні Беларускай ССР на аднолькавых правах з РСФСР, УССР і ЗСФСР у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

### Было сказана

**Пятрусь МАКАЛЬ, паэт:**

*«Дбаючы разам з векам*
*Аб электронным цудзе,*
*Памятай —*
*чалавекам*
*ніхто за цябе не будзе».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.21 | 16.47 | 7.26 |
| Віцебск — | 9.18 | 16.29 | 7.11 |
| Магілёў — | 9.11 | 16.37 | 7.26 |
| Гомель — | 8.59 | 16.42 | 7.43 |
| Гродна — | 9.35 | 17.04 | 7.29 |
| Брэст — | 9.27 | 17.13 | 7.46 |

## Месяц

***Маладзік 18 снежня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

## Імяніны

***Пр.** Навума.*
***К.** Альфрэда, Ізыдара, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Навукоўцы высветлілі, што марскія свінкі, якія жывуць сярод пітушчых людзей, нядрэнна разбіраюцца ў палітыцы і футболе.

**Малады чалавек прыходзіць да цешчы з цесцем. Цешча пытаецца:**

**— Што гэта ты, зяцёк, вырашыў да нас зазірнуць?**

**— Ды з жонкай пасварыўся, і яна паслала мяне да чарцей...**

Не здзіўлюся, калі на алімпіядзе выйграе плывец з ЗША на маторцы з даведкай ад ВАДА, што ён не ўмее плаваць.

**— Я ўсё ж паступлю ў тэатральны інстытут.**

**— Як гэта, Фіма? У цябе ж няма ніякіх даных!**

**— А дзядзька Сёма?..**




Родную, любую **Валянціну Іванаўну ЛЯЎШУ** — цудоўнага доктара і прыгожай душы чалавека — шчыра віншуем з днём нараджэння!

*Жадаем быць заўжды багатай:*
*Багатай шчасцем і спакоем,*
*Здароўем, радасцю ў сям'і,*
*Сябрамі вернымі, любоўю*
*І ўсім прыгожым на зямлі!*

**З удзячнасцю твае родныя — сястра, сыны, нявесткі і ўнукі.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4735.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2017 года.